2

По реестру № 369

ЦЕНТРАЛЬНЫЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ
АРХИВ-МУЗЕЙ ЛИТЕРАТУРЫ
И ИСКУССТВА БССР

Міровіч Еўсцігней Афінагенавіч,
рэжысёр, акцёр, драматург, народны
артыст БССР
29 ліпеня 1878 – 16 лютага 1952

Фонд № 142 ОЦ

Вопіс № 1

/1900-я/ – 1978

ЦЭНТРАЛЬНЫ ДЗЯРЖАУНЫ АРХІУ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА БССР

# МІРОВІЧ ЕУСЦІГНЕЙ АФІНАГЕНАВІЧ -

ОЦ

беларускі савецкі драматург, рэжысёр, педагог, народны артыст БССР

29 ліпеня (10 жніуня) 1878 - 16 лютага 1952

ФОНД № 142

ВОПІС № 1

/1900-я/-1978

# З М Е С Т

## да вопIсу №I фонда № I42

| Назва раздзелу | № спраў | № стар. вопIсу |
|---|---|---|
| Прадмова | | I - III |
| I. Творчыя матэрыялы Е.А.МIровIча | I - 26 | I - 4 |
| I.I. РукапIсы п'ес | I- 22 | I - 3 |
| 2. Матэрыялы да бIяграфII Е.А.МIровIча | 27 - 43 | 4 - 7 |
| 3. Матэрыялы аб Е.А.МIровIчу. | 44 - 47 | 7 |
| 4. Выяўленчыя матэрыялы. | 48 - 53 | 7 - 8 |

# ПРАДМОВА.

МIровIч (Дунаеў) ЕўсцIгней АфIнагенавIч нарадзIўся 29 лIпеня (IO жнIўня) I878 г. у г. Пецярбурзе ў сям'I чыгуначнIка з БеларусI. У I895 г. скончыў Самсонаўскае рэальнае вучылIшча, адначасова вучыўся ў вячэрняй школе малявання пры АкадэмII мастацтваў. У сваёй аўтабIяграфII Е.А. МIровIч пIша: "Не маючы сродкаў прадаўжаць адукацыю, я вымушан быў паступIць на работу. Працаваў на пошце, але не трацIў надзеI стаць артыстам. Дзякуючы шчаслIваму выпадку, я паступаю ў "ПецярбургскI гурток аматараў драматычнага мастацтва Iмя Волкава"[1]. Яму было ў той час I8 гадоў.

СцэнIчную дзейнасць як акцёр I рэжысёр ён пачаў у I900 г. у АдмIралцейскIм тэатры Пецярбурга, затым-у ЕкацярынIнскIм тэатры (I903 г.), прымае ўдзел у сварэннI новага тэатра "АрлекIн", гастраляваў у прыгарадах Пецярбурга з тэатрам "Народны дом". З I906 г. Е.А. МIровIч-правадзейны член Санкт-Пецярбургскага саюза драматычных I музычных пIсьменнIкаў. Ў гэтым жа годзе ён пIша сваю першую п'есу "Опекуны"[2], якая так I не ўбачыла сцэны.

У I9IO г. МIровIч-артыст працуе ў кранштацкIм тэатры "Камерцыйнага сходу" у драматычнай трупе I.Б. Самарына-Эльскага , у I9II г. становIцца рэжысёрам I кIраўнIком трупы гэтага тэатра. ЛетнI сезон I9II г. працуе ў драматычнай трупе пад кIраўнIцтвам Б.С. НяволIна. З гэтага часу Е.А. МIровIч пераходзIць на пецярбургскую сцэну, у трупу ТроIцкага тэатра мIнIяцюр. Сезон I9I3-I9I4 гг. ён -у аб'яднанай трупе ЛIцейна-Iнтымнага тэатра пад кIраўнIцтвам Е. Масалавай I Б.С. НяволIна. У I9I5 г. аб'яднаная трупа зноў падзяляецца на два тэатры. МIровIч застаецца ў Iнтымным тэатры, а ў I9I6 г.-зноў ЛIцэйны тэатр, дзе ён працуе да КастрычнIцкай рэвалюцыI. З трупай гэтага тэатра ён абслугоўвае вайсковыя часцI I санIтарныя цягнIкI.

У I9I6 г. рашэннем Наркамасветы (за подпIсам А.В. Луначарскага) трупа ЛIцэйнага тэатра накIроўваецца у прыфрантавую паласу, у Беларусь. У г. МIнску Е.А. МIровIча затрымала белапольская акупацыя. Ён працаваў у рускай драме мастацкIм кIраўнIком, рэжысёрам I акцёрам, адначасова прымаў удзел у падрыхтоўцы маладых тэатральных кадраў для беларускай

---

[1] спр.35, л.I

[2] РукапIс захоўваецца у ЛенIнградскай дзяржаўнай тэатральнай бIблIятэцы Iмя А.В. Луначарскага.

сцэны. У 1921 г. быў заняты таксама у спектаклях "Тэрэўсата" (тэатра рэвалюцыйнай сатыры). У гэтым жа тэатры ставіліся яго дзве аднаактовыя п'есы: "Ордэр жылаадзела" і "Недастойныя тыпы".

З 1921 г. пачынаецца супрацоўніцтва Е.А. Міровіча з Беларускім драматычным тэатрам (БДТ, цяпер тэатр імя Я.Купалы), дзе ён працуе мастацкім кіраўніком да 1932 г. (з 1925 па 1927 г.- рэжысёрам БДТ).

Е.А. Міровіч уваходзіў у групу ініцыятараў новага рускага тэатра у г. Мінску-тэатра "Шануар", які адкрыўся 3 кастрычніка 1922 г. Гэты тэатр паказваў гледачу мастацкія мініяцюры, музычныя камедыі, гратэскі і інш.

Працуючы ў БДТ Еусцігней Афінагенавіч вывучае беларускую мову, гісторыю і літаратуру. Ім напісана 8 п'ес на беларускай мове: "Машэка" (паст. 1925), камедыя "Кар'ера таварыша Брызгаліна" (паст. 1925), гістарычная драма "Кастусь Каліноўскі" (паст, 1923) і інш.

Карпатліва і плённа працаваў Міровіч з маладымі беларускімі драматургамі. На сцэне БДТ-І ім было пастаулена усяго 43 спектаклі, сярод іх беларускіх аўтараў: "На Купалле" М.Чарота, "Вяселле" В. Гарбацэвіча (1921), "Змрок" В. Шашалевіча (1927), "Гута" Р. Кобеца (1930) і інш.

У 1931-1936 г.г. Е.А. Міровіч працуе ў Гомельскім тэатры рабочай моладзі (ТРАМ), які ў 1935 г. быў рэарганізаваны ў Першы беларускі калгасна-саўгасны тэатр, праводзіць заняткі на драматычных курсах пры тэатры.

1936-1940 г.г.-мастацкі кіраўнік і рэжысёр Беларускага тэатра юнага гледача імя Н.К. Крупскай.

Адначасова ў 1939-1941 г.г. працуе мастацкім кіраўніком і педагогам Рэспубліканскага тэатральнага вучылішча.

З 1941 г. па 1944 г. знаходзіўся з БДТ-І у Томску. Тут ім былі пастаўлены п'есы К. Фіна "Пётр Крымаў", В. Галачынера "Жыццё вучыць" і Я. Рамановіча "Палешукі".

Восенню 1944 г. разам з калектывам тэатра імя Я.Купалы Міровіч вяртаецца ў вызвалены Мінск. Рэжысёрскай дзейнасцю ён ужо больш не займаецца, а цалкам аддаецца навучальна-выхаваўчай рабоце. Працаваў у драматычнай студыі пры тэатры імя Я.Купалы педагогам, вёў курс акцёрскага майстэрства.

У 1945 г. у Мінску быў адкрыт Беларускі дзяржаўны тэатральны інстытут, куды Міровіч пайшоў працаваць намеснікам дырэктара па

вучэбнай часці. З верасня 1947 г. па кастрычнік 1948 г. ён-загадчык кафедры майстэрства акцёра (у лістападзе 1947 г. становіцца прафесарам гэтай кафедры). З кастрычніка 1948 па студзень 1950 г. Міровіч-дырэктар Інстытута.[1]

Е.А. Міровіч быў узнагароджаны ордэнамі: Працоўнага Чырвонага Сцяга (1940, 1949), "Знак Пашаны", ганаровымі граматамі.

Меў званні заслужанага артыста БССР (1928) і народнага артыста БССР (1940).

Е.А. Міровіч памёр 16 лютага 1952 г.

Матэрыялы асабістага архіва Е.А. Міровіча паступілі на дзяржаўнае захаванне у ЦДАМЛМ БССР у 1967 г. ад пісьменніцы Л.Л. Арабей і дачкі рэжысёра К.Е. Дунаевай у 1984 г.

У выніку навукова-тэхнічнай апрацоўкі сфарміравана 53 справы за /1900-я/-1978 г.г. і складзены вопіс №1. Невялікі аб'ём матэрыялаў архіва тлумачыцца тым, што дакументы Е.А. Міровіча загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны. У Ленінградскай публічнай бібліятэцы імя М. Салтыкова-Шчадрына і тэатральнай бібліятэцы імя А. Луначарскага захоўваецца каля чатырох дзесяткаў п'ес Е. Міровіча дарэвалюцыйнага перыяду, многія з якіх у свой час мелі вялікі поспех і карысталіся папулярнасцю ("Графиня Эльвира", "Вова приспособился", "Театр купца Епишкина" і інш. Некаторыя з іх увайшлі ў склад архіва ў машынапісных копіях-гэта рукапісы п'ес (спр.1-20), якія паступілі з асабістым архівам тэатразнаўца А.К. Саннікава і па рашэнню ЭМК далучаны да фонда Е.А. Міровіча. Таксама рукапісы п'ес адкладзіліся ў фондзе №313 А.А. Есакова.[2]

1. У раздзел увайшлі п'есы, размешчаныя па храналогіі. Сярод іх дзве п'есы, напісаныя для БДТ-1: "Кавалль-ваявода (1924 г., паст. 1925 г.) і "Запяюць верацёны" (1927 г., паст. 1928 г.).

У канцы падраздзела знаходзяцца фатаграфіі, звязаныя творчай дзейнасцю Е. Міровіча як акцёра, драматурга і рэжысёра.

Справы ў 2, 3, 4 раздзелах размешчаны па храналогіі.

Навукова-тэхнічную
апрацоўку фонда правяла
і вопіс склала
заг. аддзела ІПС [signature] В.Я. Данекіна

14.09.88

[1] гл. архіў БДТМІ, воп.3, спр.27

[2] гл. таксама Імянны каталог

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ЦДАМЛМ БССР
Г.І.Сурмач

ПРАТАКОЛ ЭМК №14
11.11.88

| Порядковый № | Делопроизводственный № | Название дел и других единиц хранения | Даты начала и окончания (крайние даты) | Количество листов | Отметки |
|---|---|---|---|---|---|
| | | І. ТВОРЧЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ Е.А.МІРОВІЧА. | | | |
| | | І.І. РУКАПІСЫ П'ЕС. | | | |
| | I | "Графиня Эльвира". Шарж у 2-х дзеях на салдацкі спектакль Н-скага палка. Маш.копія. | I9I0 | 24 | |
| | 2 | "Негр-злодей, или черный друг опаснее белых двух". Кінемадрама ў 7-мі карцінах. Маш.копія. | I9I0 | I7 | |
| | 3 | "Вова приспособился". Камедыя ў 2-х дзеях. Маш.копія. | I9II | 25 | |
| | 4 | "Джиоконда найдена". П'еса ў адной дзеі. Маш.копія. | I9II | I6 | |
| | 5 | "Загробная дисциплина". П'еса ў адной дзеі. Маш.копія. | I9II | I7 | |
| | 6 | "Рыцарь дон Фернандо". Ілжыва-класічная трагедыя з закулiснага жыцця ў 2-х дзеях. Маш.копія. | I9II | 26 | |
| | 7 | "Обозрение Кронштадта". П'еса ў адной дзеі. Маш.копія. | I9II | I8 | |

60об.



| Парадковый № | Делопроизводственный № | Название дел и других единиц хранения | Даты начала и окончания (крайние даты) | Количество листов | Отметки |
|---|---|---|---|---|---|
| | 8 | "Остановитесь" (Фабрика талантов). П'еса ў 4-х дзеях. Маш.копIя. | I9I2 | 62 | |
| | 9 | "Потерянный или возвращенный миллион"... П'еса ў адной дзеI. Маш.копIя. | I9I2 | 23 | |
| | I0 | "На небоскребе". П'еса ў адной дзеI. Маш.копIя. | I9I3 | II | |
| | II | "Первая победа" ("Тевтоны"). Гратэск у адной дзеI. Маш.копIя. | I9I4 | I7 | |
| | I2 | "Какой нахал". Камедыя ў адной дзеI. Маш.копIя. | /I9I4/ | I4 | |
| | I3 | "Театр купца Епишкина". Сатыра ў адной дзеI. Маш.копIя. | I9I4 | 25 | |
| | I4 | "Боярышня Маня и Сенька-разбойник". Шарж на яурэйскI спектакль у 2-х дзеях. Маш.копIя. | /I9I0-я гг/ | I8 | |
| | I5 | "Законный повод". П'еса ў адной дзеI. Маш.копIя. | /I9I0-я гг/ | II | |
| | I6 | "Куда, куда вы удалились?...". П'еса ў адной дзеI. Маш.копIя. | /I9I0-я гг/ | 8 | |

Логойск, типография. Зак. 244. Тир. 4000. 22.I.81 г.

| Порядковый № | Делопроизводственный № | Название дел и других единиц хранения | Даты начала и окончания (крайние даты) | Количество листов | Отметки |
|---|---|---|---|---|---|
| | I7 | "Культурный отдых". П'еса ў адной дзеI. Маш.копIя. | /I9I0-я гг/ | 6 | |
| | I8 | "Не ревнуй". Непаразуменне ў адной дзеI. Маш.копIя. | /I9I0-я гг/ | I5 | |
| | I9 | "Свободная любовь". ТрагIкамедыя ў адной дзеI. Маш.копIя. | /I9I0-я гг/ | 9 | |
| | 20 | "Тихий человек". П'еса ў адной дзеI. Маш.копIя. | /I9I0-я гг/ | I0 | |
| | 2I | "Каваль-ваявода". П'еса. РукапIс з праўкамI Е.А.МIровIча. | I924 | I03 | ОЦ |
| | 22 | "Запяюць верацёны". П'еса ў 4-х дзеях. ГранкI. | I927 | 80 | ОЦ |

x x
x

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 23 | Е.А.МIровIч. "Театр купца Епишкина". КампазIцыя аднаактовых камедый I сцэнIчная рэдакцыя Г.Марчука. КсеракопIя. | I978 | 65 | |

x x
x

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 24 | ФатаграфIя Е.А.МIровIча ў ролI | /I900-я гг/ | I | ОЦ |

70об



| Порядковый № | Делопроизводственный № | Название дел и других единиц хранения | Даты начала и окончания (крайние даты) | Количество листов | Отметки |
|---|---|---|---|---|---|
| | | матроса ў нявызначаным вадэвIлI. | | | |
| 25 | | Фотарэпрадукцыя дзеючых асоб спектакля "Графиня Эльвира" (па п'есе Е.А.МIровIча), пастаўленага ЛIцейным тэатрам мIнIяцюр у г.Пецярбургe. | /I910/ | I | |
| 26 | | ФотарэпрадукцыI сцэн з спектакляў "МIжбур'е" Д.КурдзIна, "Гута" Р.Я.Кобеца, пастаўленых Е.А.МIровIчам у БДТ-I.<br>Сцэны з спектакляў Беларускага дзяржаўнага яўрэйскага тэатра.<br>л.I аб. | /пачатак I930-х гг/ | 2 | |
| | | 2. МАТЭРЫЯЛЫ ДА БIЯГРАФII Е.А.МIРОВIЧА. | | | |
| 27 | | Прашэнне Е.А.Дунаева Галоўнаму ўпраўленню па справах друку ў Пецярбургe аб дазволе на пастаноўку п'есы "Опекуны".<br>Маш.копIя. /I950-я гг./ | /I906/ | I | |
| 28 | | Водгук цэнзара драматычных твораў на п'есу Е.А.Дунаева "Опекуны".<br>Маш.копIя. /I950-я гг./ | I5 лютага I906 | I | |
| 29 | | Указ ПрэзIдыума Вярхоўнага Савета БССР аб прысваеннI звання народнага артыста БССР Е.А.МIровIчу.<br>Маш.копIя. | 2I студзеня I940 | I | |
| 30 | | Праграма экзаменаў БДТ-I па май - | 24 чэрвеня 1946 | 2 | |

Логойск, типография. Зак. 244. Тир. 4000. 22.I.81 г.

| Порядковый № | Делопроизводственный № | Название дел и других единиц хранения | Даты начала и окончания (крайние даты) | Количество листов | Отметки |
|---|---|---|---|---|---|
| | | стэрству акцёра курса Е.А.МІровІча. | | | |
| | 3I | ВІншавальная тэлеграма начальнІка ПІнскага абладдзела мастацтв Дашкоўскага Е.А.МІровІчу ў сувязІ з 25-годдзем утварэння тэатра Імя Я.Купалы. | /I946/ | I | |
| | 32 | Атэстат прафесара Е.А.МІровІча па кафедры майстэрства акцёра. | 22 лІстапада I947 | 2 | |
| | 33 | ЛІст аддзела па ўлІку І рэгІстрацыІ ўзнагароджаных пры Сакратарыяце ПрэзІдыўма Вярхоўнага Савета БССР Е.А.МІровІчу аб запаўненнІ ўчотнай картачкІ да ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга. | 20 верасня I949 | I | |
| | 34 | СпІсак п'ес, напІсаных І пастаўленых Е.А.МІровІчам. Аўтограф Е.А.МІровІча. | /I940-я гг/ | I | ОЦ |
| | 35 | АўтабІяграфІя. Аўтограф Е.А.МІровІча. | /I950-I952/ | 2 | ОЦ |
| | | x x x | | | |
| | 36 | Ганаровыя граматы НовасІбІрскага абласнога савета дэпутатаў працоўных І Томскага гаркома УЛКСМ за культурнае абслугоўванне працоўных СІбІры ў днІ ВялІкай Айчыннай вайны. | II верасня I943 - 7 верасня I944 | 5 | |

8об



| Порядковый № | Делопроизводственный № | Название дел и других единиц хранения | Даты начала и окончания (крайние даты) | Количество листов | Отметки |
|---|---|---|---|---|---|
| | 37 | Ганаровая грамата Томскага гарвыканкома савета дэпутатаў працоўных за стварэнне спектакля "Полещуки". | 3I мая 1944 | I | |
| | 38 | Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета БССР за шматгадовую плённую працу у развIццI тэатральнага мастацтва БССР I ў сувязI з 25-годдзем тэатра Iмя Я.Купалы. | I4 лIстапада I946 | 2 | |
| | | x x x | | | |
| | 39 | ВIншавальны адрас артыстаў трупы Кранштацкага тэатра "Камерцыйнага сходу" А.Е.МIровIчу.ў сувязI з I0-цI годдзем сцэнIчнай дзейнасцI. | I3 лютага I9I0 | I | ОЦ |
| | 40 | "Трыбуна мастацтва". ЧасопIс,прысвечаны 25-годдзю творчай дзейнасцI Е.А.МIровIча. Друк.выд. | 26 красавIка I925 | 8 | ОЦ |
| | 4I | Нарыс I нататкI, прысвечаныя 70- I 90-годдзю з дня нараджэння Е.А. МIровIча. ВыразкI з газет. | I948,I968 | 2 | |
| | 42 | Нарысы Я.С.РамановIча, А.В.Сабалеускага, прысвечаныя I00-годдзю з дня нараджэння Е.А.МIровIча. ВыразкI з часопIсаў I газет. | жнIвень I978 | I3 | |
| | 43 | Запрашэнне на ўрачысты вечар, прысвечаны I00-годдзю з дня нараджэння Е.А.МIровIча. | I8 кастрычнIка I978 | 2 | |

Логойск, типография. Зак. 244. Тир. 4000. 22.I.81 г.

| Порядковый № | Делопроизводственный № | Название дел и других единиц хранения | Даты начала и окончания (крайние даты) | Количество листов | Отметки |
|---|---|---|---|---|---|
| | | **3. МАТЭРЫЯЛЫ АБ Е.А.МІРОВІЧУ.** | | | |
| | 44 | Некралог аб Е.А.МІровІчу. Выразка з газеты. | 23 лютага 1952 | I | |
| | 45 | "Смех не ради смеха", "Гады станаўлення". Нарысы С.А.ПятровІча аб творчай дзейнасцІ Е.А.МІровІча. ВыразкІ з часопІса І газеты. | красавІк, I5 лІстапада I960 | 7 | |
| | 46 | Артыкулы, нататкІ, успамІны з упамІнаннем Е.А.МІровІча. Газета, выразкІ з газет. | I7 лютага 1946 - I2 лІстапада I970 | 7 | |
| ОЦ | 47 | "У истоков", "Спектакль в деревне". УспамІны В.І.ГалІны, Я.С.РамановІча аб Е.А.МІровІчу. ВыразкІ з газет. | кастрычнІк /I970/, I6 мая I974 | 2 | |
| ОЦ | | **4. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ** | | | |
| | 48 | ФатаграфІІ Е.А.МІровІча. Частка копІІ. ВІншавальны надпІс У.І.УладамІрскага ад I8 жнІуня I950г., л.7 | /I900-я - I950-я гг/ | 7 | ОЦ |
| | 49 | Фотарэпрадукцыя: Е.А.МІровІч сярод акцёраў аднаго з пецярбургскІх тэатраў. | /I900-я - I9I0-я гг/ | I | |
| | 50 | ФатаграфІя Е.А.МІровІча сярод акцёраў Беларускага тэатра юнага глядача Імя Н.К.Крупскай пасля прэм'еры спектакля "Голубое и розовое" | /I939/ | I | ОЦ |

9об.



| Порядковый № | Делопроизводственный № | Название дел и других единиц хранения | Даты начала и окончания (крайние даты) | Количество листов | Отметки |
|---|---|---|---|---|---|
| | | А.Бруштэйна. КопIя. | | | |
| | 5I | ФатаграфII Е.А.МIровIча сярод артыстаў Беларускага тэатра юнага глядача Iмя Н.К.Крупскай у дзень прысваення звання народнага артыста БССР. КопII. | I940 | 2 | ОЦ |
| | 52 | ФатаграфIя журы агляда мастацкай самадзейнасцI ў МIнскIм АДА: Е.А.МIровIч, С.С.БIрыла, I.М.БалоцIн, В.У.ГалIна, Р.В.Млодак, Б.З.ЯнпольскI I Iнш. | I947 | I | |
| | 53 | ФатаграфIя I фотарэпрадукцыя : Е.А.МIровIч сярод выкладчыкаў I студэнтаў БДТI. | I947-I949 | 3 | |

У дадзены вопIс № I унесена 53 (пяцьдзесят тры) справы з № I па № 53.

Заг.аддзела В.Данекина В.Я.ДанекIна

09.09.88г.

Хр. Федосов [signature] Б.Л. Бенковская

28.11.88

Для тэматычнага каталога БДАМЛМ распрацавана "30" красавіка 1998 г. Подпіс

Для ... БДАМЛМ ... "30" красавіка 1998 г. Подпіс

Логойск, типография. Зак. 244. Тир. 4000. 22.I.81 г.

В описи № 1 ф. № 142
прошито и пронумеровано
9 (девять) листов.
28.12.88

[signature]